# Гісторыя

В. В. ГАРБАЧОВА

## НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧЫ РУХ НА БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII — ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XIX ст.

Даследаваннем дзейнасці тайных таварыстваў у Польшчы, Літве, Беларусі, на Украіне з канца XVIII ст. і напярэдадні паўстання 1830 г. займаліся як дарэвалюцыйныя, так і савецкія гісторыкі. У расійскім дзяржаўным ваенна-гістарычным архіве (РДВГА) у фондах Канцылярыі начальніка галоўнага штаба я. і. в., Канцылярыі начальніка галоўнага штаба ў Варшаве графа Куруты захоўваюцца матэрыялы, якія дазваляюць больш дэтальна асвятліць гісторыю існавання і дзейнасці тайных таварыстваў напярэдадні паўстання 1830 г. Гэтыя дакументы дапамагаюць узнавіць цэласную карціну ўзнікнення тайных арганізацый і адлюстраваць прынцыпы іх сувязі як у Каралеўстве Польскім, так і на Беларусі.

Палітыка царызму на Беларусі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, падаўлення паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі выклікала ў беларускім грамадстве незадаволенасць. Але прыняцце ў 1815 г. канстытуцыі Каралеўства Польскага, абяцанні Аляксандра I аб пашырэнні тэрыторый, яму (Каралеўству Польскаму — В. Г.) падуладных, падняла грамадскі настрой. Беларуская шляхта звязвала свой лёс з адраджэннем Рэчы Паспалітай, а распаўсюджванне канстытуцыйнага ладу на землі ВКЛ давала падставу для здзяйснення мары аб узнаўленні незалежнай Рэчы Паспалітай, якая адпаведна пагадненням Люблінскай уніі 1569 г. існавала як канфедэрацыя Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. Але ўжо к 1820 г. стала відавочным, што Аляксандр I не толькі не збіраецца пашыраць тэрыторыю Каралеўства Польскага, а павёў наступ на дэмакратычныя свабоды, дараваныя канстытуцыяй 1815 г. Гэта з'явілася штуршком для ўзнікнення польскіх тайных таварыстваў. Нацыянальна-вызваленчыя ідэі ахапілі і Беларусь.

Тайныя таварыствы ўзнікалі напачатку на тэрыторыі Каралеўства Польскага, аднак заўсёды знаходзілі сваіх прыхільнікаў на Беларусі. Адна з першых тайных арганізацый, якая выступіла за ўзнаўленне Рэчы Паспалітай, узнікла адразу пасля трэцяга падзелу гэтай дзяржавы. У 1796 г. існавала тайнае таварыства ў Познані. У гэты ж час пачала дзейнічаць тайная арганізацыя і ў Вільні, якая хутка была раскрыта царскімі ўладамі. Па справе аб прыналежнасці да таварыства арыштавалі і сурова асудзілі 70 чалавек.

Паступова ідэі нацыянальна-вызваленчага руху пранікалі і ў масонскае асяроддзе. Адраджэнне масонства праходзіла з благаславення Аляксандра I, чые інтарэсы ў дадзены момант супадалі з інтарэсамі палякаў: ні той ні другі бок не былі задаволены вынікамі Венскага кангрэсу 1815 г. На працягу 1815 — 1820 гг. нацыянальна-вызваленчы рух праходзіў пад прыкрыццём афіцыйнага масонства. Масонскія ложы дзейнічалі і на тэрыторыі Беларусі.

Узнікшае ў 1819 г. таварыства «Нацыянальнае масонства» мела ўжо рысы тайнай арганізацыі і ставіла перад сабой мэту адраджэння Рэчы Паспалітай ў «як мага больш шырокіх межах»[1]. У сувязі з гэтым кіраўнік

«Нацыянальнага масонства» В. Лукасінскі паставіў задачу арганізаваць падобныя таварыствы ў кожнай правінцыі Рэчы Паспалітай. Стаць эмісарам «Нацыянальнага масонства» ў былым Княстве Літоўскім было даручана І. Гружэўскаму. Дзякуючы актыўнай прапагандзе ідэй таварыства ў склад яго членаў увайшлі выдатныя прадстаўнікі шляхты Віленскай губерні: М. Ромер, І. Белазёр, І. Струміла, князь К. Радзівіл, граф Солтан. У жніўні 1820 г. было аб'яўлена аб роспуску таварыства, якое ў маі 1821 г. узнавілася ў выглядзе тайнай арганізацыі «Патрыятычнае таварыства». Узначальваў арганізацыю Цэнтральны камітэт, які накіроўваў сваіх эмісараў у Літву, Падолію, Валынь, Познань і Беларусь для стварэння там мясцовых аддзяленняў арганізацыі. Летам 1821 г. у Вільні эмісарам А. Аборскім было заснавана рэгіянальнае аддзяленне «Патрыятычнага таварыства», куды ўвайшлі, акрамя членаў існаваўшай раней арганізацыі «Нацыянальнае масонства», граф К. Прозар, І. Хадзько, Т. Зан[2]. К. Радзівіл выступаў заснавальнікам таварыства ў Навагрудскім павеце. Па сведчаннях М. Махнацкага, галоўнай мэтай таварыства было аднаўленне незалежнасці польскай дзяржавы ў межах 1772 г., для дасягнення якой лічыліся прымальнымі любыя сродкі, у тым ліку і рэвалюцыйныя метады барацьбы[3].

У 1823 г. на Беларусі і ў Літве дзейнічаў «Саюз тампліераў» (храмоўнікаў), цэнтр якога знаходзіўся на Валыні. Асноўнай мэтай гэтага саюза было вызваленне Польшчы ад ворагаў, пазбавіўшых яе незалежнасці і свабоды (г. зн. Расіі, Прусіі, Аўстрыі). У складзе членаў саюза было нямала выхадцаў з Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў. І хаця шырокага распаўсюджвання на Беларусі гэта арганізацыя не атрымала, аднак яе ролю нельга прымяншаць, таму што яе членамі былі пастаўлены канкрэтныя задачы ў барацьбе за дасягненне незалежнасці Айчыны.

Важнейшым момантам у гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху Польшчы, Літвы, Беларусі з'явілася ўстанаўленне сувязей з рускімі дзекабрысцкімі таварыствамі. На працягу 1822—1823 гг. прадпрымалася некалькі спроб для наладжвання кантактаў з членамі польскага «Патрыятычнага таварыства». Такая сустрэча адбылася ў студзені 1824 г. у Кіеве. З польскага боку прысутнічалі С. Ф. Крыжаноўскі і А. С. Ябланоўскі, ад паўднёвага таварыства — С. Мураўёў-Апостал[4]. Па ходу сустрэчы ўзнікала пытанне і аб сумесным выступленні супраць царызму, аднак перагаворы па гэтаму пытанню не былі завершаны. Няўзгодненасць у дзеяннях польскіх і рускіх тайных таварыстваў у многім тлумачылася адрозненнем асноўных мэтаў. «Патрыятычнае» — лічыла асноўным пунктам сваёй праграмы нацыянальнае вызваленне, узнаўленне незалежнасці шляхецкай дзяржавы ў межах 1772 г. Для дзекабрыстаў галоўным было змяненне дзяржаўнага ладу, вырашэнне сялянскага пытання, устанаўленне рэспубліканскай формы праўлення. Адрозненні ў праграмах дзекабрысцкіх і польскіх таварыстваў прывялі да таго, што выступленне на Сянацкай плошчы было падтрымана толькі «Таварыствам ваенных сяброў», прадстаўленым афіцэрамі Літоўскага корпуса, студэнтамі Беластоцкай і Свіслацкай гімназіяў, якіх турбавалі тыя ж пытанні, што і дзекабрыстаў[5]. 24 снежня 1825 г., праз дзесяць дзён пасля няўдалага выступлення на Сянацкай плошчы, капітан К. Г. Ігяльстром і паручнік А. І. Вягелін прызвалі свае роты, якія размяшчаліся ў Беластоцкім павеце і ўваходзілі ў склад Літоўскага асобнага корпуса, адмовіцца ад прысягі Мікалаю І. Паўстанне Літоўскага піянерскага батальёна ўжо на наступны дзень было падаўлена, а яго ініцыятары падзялілі лёс дзекабрыстаў.

Нацыянальна-вызваленчы рух шырока ахапіў і студэнцкае асяроддзе. Створанае ў канцы 1817 — пачатку 1818 г. студэнтамі Віленскага універсітэта «Таварыства філаматаў» (аматараў ведаў) намервалася пры дапамозе культурна-асветніцкіх мэтаў дасягнуць «дабрабыту айчыны»[6]. Для павелічэння колькасці прыхільнікаў нацыянальна-асветніцкіх ідэй адзін з заснавальнікаў таварыства Т. Зан, жыхар Вілейскага павета Мінскай губерні, вясной 1820 г. заснаваў яшчэ адну арганізацыю віленскіх студэнтаў — «Прамяністыя». Асноўныя задачы таварыства адзначаны ў статуце: «...желать добра своим единоземцам, каждого состояния и целому народу вообще, сохранять отцов своих полезные обычаи,

любить природный язык и оному учиться, имея в памяти доблести и подвиги предков, подражать оным по мере сил своих и состояния»[7]. К лету 1820 г. уладам стала вядома, што члены таварыства займаліся прапагандай польскай гісторыі і культуры. Па загаду рэктара Віленскага універсітэта таварыства было распушчана. У той жа прыкладна час (лета 1820 г.) на аснове «філаматаў» і «прамяністых» было заснавана новае таварыства — «філарэтаў», якое па свайму складу было больш масавым, чым папярэднія. Філіялы філарэтаў ствараліся ў розных паветах Літвы і Беларусі. Адносіны да гэтага таварыства мелі 54 жыхары Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губерняў[8]. У дзейнасці філарэтаў узмацняліся нацыянальныя, палітычныя, антыдзяржаўныя матывы, у якасці галоўнай мэты нацыянальна-вызваленчых сіл ставілася ўзнаўленне незалежнасці Рэчы Паспалітай у межах 1772 г.

Некалькі студэнцкіх арганізацый ў 1820—1824 гг. існавала ў м. Свіслач Гродзенскай губерні. У адпаведнасці з рапартам Навасільцава кн. Канстанціну ўстаноўлена, што ў 1820 г. у Беластоку вучнем мясцовай гімназіі Феліксам Ляховічам было створана «Таварыства згодных братоў»[9]. У 1823 г. Ляховіч заснаваў падобнае таварыства ў Свіслацкай гімназіі, дзе ў яго склад уваходзіла каля 30 вучняў пятага класа[10]. Акрамя названай арганізацыі ў гімназіі існавалі «Вучэбнае (навуковае) таварыства», якое складалася з вучняў шостага класа і ўзначальвалася Д. Шлаеўскім[11], і «Маральнае таварыства», створанае прыватнымі настаўнікамі, выпускнікамі гімназіі. Асноўную мэту члены таварыства бачылі ў выхаванні нацыянальнага патрыятызму і заваяванні незалежнасці Айчыны.

У 1823 г. Ф. Ляховіч пераўтварыў «Таварыства згодных братоў» у «Таварыства заран»[12]. Пры расследаванні было адзначана, што дзейнасць таварystваў не абмяжоўвалася толькі пытаннямі маралі і культуры. Невыпадкова свіслацкія і беластоцкія гімназісты склалі трэцюю ступень «Таварыства ваенных сяброў», прадстаўнікі якога падтрымалі паўстанне дзекабрыстаў. Дзейнасць «Таварыства заран» працягвалася ўжо ў Віленскім універсітэце, куды пасля заканчэння Свіслацкай гімназіі (1825 г.) паступіла 13 яго членаў[13]. У 1826 г. яны вырашылі спыніць існаванне таварыства. Аднак, нягледзячы на гэта, следчая камісія падзяліла ўсіх маючых дачыненне да заран на тры разрады, актыўныя члены былі выключаны з універсітэта і адпраўлены радавымі ў дзеючую армію.

У кастрычніку — лістападзе 1827 г. група студэнтаў Віленскага універсітэта стварыла тайнае таварыства «Сармацкае племя альбо прыхільнікі айчыны»[14]. Заснавальнікам таварыства К. Захам былі складзены правілы, па якіх дзейнічала арганізацыя, тэксты прысягі і двух заклікаў. У адпаведнасці з правіламі таварыства меркавалася, што яго члены прымуць удзел у падрыхтоўцы ўзброенага паўстання для дасягнення «златой свободы Отечества»[15]. Адозвы, складзеныя К. Захам, уключалі заклік да паўстання, да свабоды: «К оружию Единоземцы! —заклікаў аўтар, — к Оружию! Изберите Вождя, а с помощью Всевышнего и покровителя нашего, восстановим Отечество наше и защищая оное при последнем его исчезании охотно отдадим жизнь свою токмо горестную по утрате возлюбленного Отечества»[16]. Арганізатары данага таварыства выношвалі думкі «з цягам часу з'яднацца з другім, больш шматлікім і важнейшым, якое дзейнічала ў тым жа напрамку»[17]. Пра існаванне гэтай арганізацыі на трэці месяц стала вядома ўладзе, і яе актывісты Зах, Тржаскоўскі, Грантоўскі і Лісоўскі былі высланы радавымі на Каўказ.

Непасрэдна перад пачаткам паўстання 1830 г. у Варшаве студэнтамі Віленскага універсітэта была заснавана тайная арганізацыя пад назвай «Мнезераў», аб якой хутка стала вядома афіцыйным уладам[18]. Адзін з заснавальнікаў таварыства, Ю. Крашэўскі, знаходзіўся ў асабістай перапісцы з І. Лялевелям. І хоць у паперах было зафіксавана, што яго асноўная мэта — «упражнение в Слоге», студэнты рыхтаваліся прыняць удзел у паўстанні: пры вобыску ў іх было знойдзена каля 60 адзінак вагнястрэльнай зброі[19]. Акрамя таго, члены таварыства прапагандавалі ў студэнцкім асяроддзі нацыянальна-вызваленчыя ідэі, распаўсюджвалі «возмутительные стихи».

Разгром дзекабрысцкага руху, рэпрэсіі супраць членаў тайных згуртаванняў спрыялі росту антыўрадавых настрояў на Беларусі. Беларуская

шляхта падтрымлівала ідэі, накіраваныя на дасягненне незалежнасці Рэчы Паспалітай пры дапамозе ўзброенага паўстання, да якога рыхталіся тайныя арганізацыі ў Каралеўстве Польскім.

[1] А с к е н а з и Ш. Царство Польское. 1815— 1830 гг. М., 1915. С. 73.
[2] Гл.: В о р о н к о в И. А. // Исторические записки. 1957. Т. 60. С. 295.
[3] Гл.: M o c h n a c k i M. Powstanie narodu polskiego w r. 1830 i 1831. Parys. 1834. S. 371.
[4] Гл.: О л ь ш а н с к и й П. // Декабристы и польское национально-освободительное движение. М., 1959.
[5] РДВГА. Ф. 156, воп. 1, спр. 100, арк. 87 (арк.).
[6] Гл.: Ш о л к о в и ч С. // Заря. 1871. № 5. С. 121.
[7] Там жа. С. 122.
[8] РДВГА. Ф. 156, воп. 1, спр. 96, арк. 364—387.
[9] Там жа. Спр. 100, арк. 85.
[10] Там жа. Арк. 33(адв.).
[11] РДВГА. Ф. 156, воп. 1, спр. 96, арк. 369.
[12] Там жа. Спр. 100, арк. 85.
[13] Там жа. Арк. 89(адв.), 90.
[14] РДВГА. Ф. 156, воп. 1, спр. 138.
[15] Там жа. Арк. 8(адв.), 15.
[16] Там жа. Арк. 15(адв.), 16.
[17] Там жа Арк. 3.
[18] Там жа. Ф. 35, воп. 9, спр. 121.
[19] Там жа. Спр. 121, арк. 1, 1(адв.).

І. Ф. РАМАНОЎСКІ, М. Г. ЖАРКОЎ

## БАРАЦЬБА НАРОДНЫХ МАС БЕЛАРУСІ СУПРАЦЬ САМАДЗЯРЖАЎЯ Ў РЭВАЛЮЦЫІ 1905—1907 гг.

Першая буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя ў Расіі наспявала на працягу многіх гадоў. На рубяжы вякоў краіна з'яўлялася імперыялістычнай дзяржавай, але імперыялізм тут быў аплецены густой сеткай рэшткаў феадальна-прыгонніцкіх адносін. Неабмежаваная самадзяржаўная ўлада перашкаджала любым дэмакратычным пераўтварэнням, буйное памешчыцкае землеўладанне працягвала трымаць у сваёй залежнасці шмат фармальна свабодных сялян. Рабочы клас таксама падвяргаўся самай жорсткай эксплуатацыі з боку нованароджанай айчыннай і замежнай буржуазіі.

Усе гэтыя адмоўныя рысы эканамічнага і палітычнага жыцця краіны былі яшчэ ў большай ступені ўласцівыя Беларусі. З-за адсутнасці ў беларускіх нетрах жалезнай руды, нафты, каменнага вугалю і іншых карысных выкапняў тут развіваліся галоўным чынам прадпрыемствы лёгкай, апрацоўчай прамысловасці, заснаваныя на мясцовай сыравіне. Такая структура прамысловасці была адной з прычын перавагі на Беларусі невялікіх і дробных фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў. На іх працавалі беларусы (75 %), рускія, украінцы, яўрэі, палякі, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. Рабочы дзень нават на буйных прадпрыемствах працягваўся 12—13 гадзін. Заработная плата не забяспечвала самы сціплы пражытачны мінімум рабочай сям'і. Не менш, калі не больш гаротным было становішча асноўнай масы сельскага насельніцтва нашага краю. Памешчыкам, казне і царкве належыла 57,3 % ворнай зямлі. Асобным магнатам (граф Патоцкі, Сапегі, Радзівілы і інш.) належыла па некалькі соцен тысяч дзесяцін. Малазямелле, нізкая ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур асуджалі масы сялянства на галечу і хранічны голад.

Велізарная краіна нястрымна ішла да сваёй першай рэвалюцыі. За 1901—1904 гг. толькі ў Беларусі адбылося 58 стачак і 25 дэманстрацый, 143 сялянскіх выступленні. Надыход рэвалюцыі значна паскорыла руска-японская вайна (студзень 1904 — жнівень 1905 г.). Паражэнні царскіх войскаў, асабліва пад Мукдэнам, падзенне Порт-Артура наглядна паказалі разлажэнне і гніласць царызму.

Рабочыя і сялянскія масы ўзняліся на барацьбу супраць царскага самадзяржаўя, за знішчэнне ўсіх перажыткаў прыгонніцтва, асабліва памешчыцкага землеўладання. Чашу народнага цярпення перапоўніла